Мы верым, што сілы польскіх дэмакратаў узрастуць, як над зямлёй Беларускай засьвеціцца зорка лепшай будучыны. А шчыры дэмакратызм створыць той залаты мост, каторы зьяднае ўрэшце народы нашага краю ў вадну вялікую згодную сям'ю і каторы польскія нацыяналісты цяпер не даюць збудаваць.

## Наша павіннасьць

Як вядома з тэлеграмаў Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, яшчэ ў лютым немцы памкнуліся падысьці пад Гродна. Пасьля крывавых бітваў яны, праўда, адышлі. Але там, дзе йшлі тыя бітвы, асталася голая пустыня: ад гарматных стрэлаў, ад пажараў зьніштожана ў тым баку ўсё, счэзьлі вёскі і сёлы...

Паплыла кроў па гонях беларускіх. Вайна ступіла на нашу зямлю, а за ёй сьледам залуналі над хатамі хлебаробаў бяда, голад.

Дагэтуль ад вайны найбольш цярпелі палякі і жыды, украінцы і літвіны: вайна ішла, бадай, увесь час на іх землях. І ўсе гэтыя народы пачалі ўраз жа працаваць, не пакладаючы рук, каб даць якую помач сваім братом, пацярпеўшым ад вайны. Пазакладаліся камітэты і таварыствы дзеля гэткай помачы — польскія, жыдоўскія, літоўскія і іншыя. Работа закіпела.

Ад нас, беларусаў, вайна была далёка, і мы ня рупіліся стварыць сваю арганізацыю дзеля падмогі ахвярам вайны. Цяпер яна закранула і наш народ.

Вось у Вільні грамадка беларусаў і надумала, што настаў час і для нас скрануцца зь месца ды пайсьці па сьлядох нашых суседзяў і братоў. Яны выпрацавалі статут „Беларускага Таварыства дзеля помачы ахвярам вайны“, і гэтымі днямі губэрскае прысуцтва яго зацьвярдзіла.

Таварыста ставіць сабе такія мэты. Яно маніцца працаваць у Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай і Вітэбскай губэрнях — у адных затым, што там патрэбна падмога зруйнаваным сялянскім гаспадаркам на месцы, у другіх — затым, што туды панаехала беднага, у каторай дома не асталося прыпынку, не асталося, як кажуць, ні двара, ні кала... Да таварыства могуць належаць усе, хто ахвоч да працы і каму закон таго не бароніць. Зь пяці членаў таварыства ў асобных гарадох і мястэчках будуць адкрывацца аддзелы таварыства, каторыя ў сваім куце і займуцца апекай над пацярпеўшымі ад вайны, — як і чым мага.

Беларускае грамадзянства павінна шчыра адклікнуцца на кліч аб помачы братом нашым. Гэта — наша сьвятая павіннасьць. Няхай па сёлах і валасьцёх нашы сяляне пастановяць прыгаворы, каб з грамадзкіх грошы даць частку на работу Беларускага Таварыства дзеля помачы ахвярам вайны. Няхай збудзяцца нашы хаўрусныя крамы, нашы местачковыя і вясковыя банчкі і з сваіх даходаў памогуць у вялікай і патрэбнай працы дзеля змаганьня зь бядой і няшчасьцем людзкім. Няхай адгукнуцца і ўсе паадзінокія беларусы, каторым удалося стануць цьвёрда на ногі і здабыць сякое–такое багацьце. Калі ўсе мы, усё беларускае грамадзянства парупіцца, дык і помач будзе вялікая, і мы споўнім сваю павіннасьць перад беларускім народам, перад тымі сынамі яго, каторых ліхая доля пакрыўдзіла.

Новае таварыства пачне акуратна працаваць ад першых дзён мая, як адбудзецца першы агульны сход[1].

## Ваўкі ў авечай скуры

Ёсьць людзі, што ўсё жыцьцё сваё хаваюцца за плячыма *народу*.

Што б яны ні рабілі, на якое благое дзела ні пайшлі б, — заўсёды выступаюць ад імені ўсяго народу.